ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
23
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 19 (1469)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
«Учора · сёння · заўтра»

### БЮРО ПАРТКОМА

**на чарговым пасяджэнні абмеркавала работу грамадскіх арганізацый і кіраўніцтва падраздзяленняў універсітэта па падрыхтоўцы да працоўнага семестра 1984—1985 навучальнага года.**

**Са справаздачай аб рабоце факультэта грамадскіх прафесій выступіў дэкан К. М. Кунцэвіч. Разгледжана таксама пытанне аб рабоце вучэбнага аддзела універсітэта.**

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

### ЗЛЕТ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ

**БДУ імя У. І. Леніна прайшоў у мінулую нядзелю на стадыёне факультэта радыёфізікі і электронікі. У праграму злёту ўваходзілі спартыўныя спаборніцтвы па футболу, валейболу, перацягванню каната і інш., конкурсы будатрадаўскай нагляднай агітацыі і мастацкай самадзейнасці.**

**Пераможцам злёту стаў зводны атрад «Мінск-85», які выязджае ў ГДР. На 2 і 3 месцах — адпаведна атрады «Стэлуца» (механіка-матэматычны факультэт) і «Дружба» (хімфак).**

**В. ЮР'ЕЎ.**

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

**конкурсу насценнага друку. 1 і 2 месцы падзялілі біяфак і журфак. На 3 месцы — факультэт радыёфізікі і электронікі. Далей месцы размеркаваліся наступным чынам: 4 — фізфак, 5 — геафак, 6 — філфак, 7 — ФПМ, 8 — хімфак, 9 — юрфак. Газеты гістарычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў на конкурс не пададзены.**

**С. БАЛЦЭВІЧ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.**

### ЛЕПШЫМІ

**ў аглядзе-конкурсе нагляднай агітацыі сярод факультэтаў прызнаны гістфак і юрфак, якія падзялілі 1 і 2 месцы, а таксама факультэт радыёфізікі і электронікі і геаграфічны (падзялілі 3 і 4 месцы). Наступныя факультэты размеркаваліся так: 5 — фізфак, 6 — журфак, 7 — біяфак, 8 — хімфак, 9 — філфак, 10 — мехмат, 11 — ФПМ.**

**А. СЛАНЕЎСКІ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.**

**ЗЛЁТ ФІЛОЛАГАЎ**



## Свята паэтычнага слова

***Імя Галіны Ракоца, студэнткі 2-га курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта, якую вы бачыце на гэтым здымку, добра вядома чытачам літаратурнай старонкі нашай газеты. Неаднойчы ў «Ружовым ранку» друкаваліся вершы дзяўчыны. Чытала свае новыя вершы Галя і на злёце філолагаў, што адбыўся ў Вязынцы, на радзіме Янкі Купалы.***

***Фотарэпартаж нашага спецыяльнага карэспандэнта са свята студэнтаў філалагічнага факультэта чытайце на 4-й старонцы газеты.***

**МЕРКАВАННІ СТУДЭНТАЎ**

## СЕСІЯ ПАЧЫНАЕЦЦА З СЕМЕСТРА

Колькі разоў студэнцтва здавала сесію! Колькі было бяссонных начэй! Колькі імгненняў, калі на стомленым твары з'яўлялася радасная ўсмешка ад выведзенай акуратным почыркам выкладчыка ў залікоўцы адзнакі «выдатна». Былі і такія хвіліны, калі зямля гублялася пад нагамі і пахмурнеў свет ад строгіх слоў экзаменатара: «Прыйдзіце яшчэ раз».

А магчыма ўсё гэта было і па іншаму. Новая пяцёрка паяўляецца ў залікоўцы, не выклікаўшы ніякіх эмоцый: «Хіба магло быць інакш?» І не было нічога падобнага на хваляванне: «Падумаеш, не здаў сёння, здам заўтра».

Думкі, меркаванні — самыя розныя. Такія, як і самі студэнты. Але сесія застаецца сесіяй. І два разы ў год, нягледзячы на надвор'е, настрой, сямейныя абставіны, яна прыходзіць. Прыходзіць і патрабуе: «Тваю залікоўку, студэнт!» Якімі адзнакамі закончыцца гэты семестр, мы і папрасілі паразважаць студэнтаў.

**Ядвіга ПЛЕСКАЦЭВІЧ, студэнтка гістарычнага факультэта:**

— Мне здаецца, што сесія — гэта праверка засваення тых ведаў, якія мы атрымліваем на працягу семестра на лекцыях, практычных і семінарскіх занятках, а таксама ў ходзе самастойнай падрыхтоўкі да сесіі. Магчыма, у будучым для ацэнкі ведаў студэнта будзе знойдзена больш дасканалая сістэма, чым сесія. Але сёння сістэма здачы залікаў і экзаменаў апраўдвае сябе. Здараецца, што пэўную ролю адыгрывае «шчаслівы білет». Але я ўпэўнена, што галоўным заўсёды застаюцца веды.

Падрыхтоўка да сесіі — заўсёды цяжкі час. Лягчэй таму, хто рыхтуецца да яе на працягу семестра, паступова. У час сесіі застаецца толькі паўтарыць вывучанае. Але не сакрэт, што многія студэнты рыхтуюць адказы на пытанні ў апошнюю перадсесійную ноч.

На працягу вучобы ва універсітэце адносіны да сесіі, вядома, мяняюцца. На першым курсе перад тым, як зайсці ў аўдыторыю, дзе ішоў экзамен, заўсёды скоўваў нейкі страх. А зараз у нас за плячыма ўжо сем даволі складаных сесій. Страху няма, а вось хваляванне засталося. З кожным годам сесіі здаваць лягчэй: ужо ёсць нейкі пэўны вопыт падрыхтоўкі да экзаменаў. Але ў той жа час адказнасць павялічваецца. Зараз мы заканчваем чацвёрты курс. Гэта значыць, што бліжэй падышлі да дзяржаўных экзаменаў. Сёлетняя сесія — адна з самых складаных. І таму патрэбна пастарацца здаць яе як мага лепш.

**Зоя ІЛЬЯСКЕВІЧ, камсорг 1-й групы IV курса гістарычнага факультэта:**

— Мне здаецца, што сесія — гэта не толькі праверка нашых ведаў, але і праверка сілы волі, працаздольнасці, таму што калі дазволіць сабе расслабіцца, то гэта абавязкова адаб'ецца на рэзультатах. Сесія дапамагае нам сістэматызаваць веды, абагульніць усё тое, што вывучалі на працягу семестра.

Гэтая сесія, як мне здаецца, самая цяжкая. Ды і наогул летнюю сесію заўсёды здаваць цяжэй, і каб паспяхова здаць яе, патрэбна прыкласці максімум намаганняў. Не абысціся і без штурмаўшчыны, таму што аб'ём матэрыялу, які патрэбна вывучыць ці паўтарыць, вельмі вялікі.

Наша група заўсёды адносіцца да сесіі сур'ёзна. Большасць студэнтаў рыхтуюцца сістэматычна, хаця і ёсць аматары штурмаўшчыны. Я лічу, што вынікі сесіі залежаць і ад атмасферы ў групе. Важна, каб была ўзаемадапамога, выручка і падтрымка таварышаў.

**Марыя Маргарэт РАДРЫГЕС, студэнтка факультэта журналістыкі (Дэмакратычная Рэспубліка Сан-Тамэ і Прынсіпі):**

— У мяне сесія пачынаецца тады, калі пачынаецца семестр. Заўсёды хаджу на лекцыі, рыхтуюся да семінарскіх і практычных заняткаў, стараюся як мага больш адказваць на іх. Справа ў тым, што калі пачынаецца сесія, то па выніках адказаў у выкладчыка ўжо складваецца пэўнае меркаванне наконт таго, якой адзнакі заслугоўвае той ці іншы студэнт. А адказы на пытанні білета яшчэ раз пацвярджаюць гэта. Магчыма іменна такая арганізацыя вучобы і дазваляе мне мець у залікоўцы толькі выдатныя адзнакі.

Калі рыхтуюся да экзамена, абавязкова размяркоўваю пытанні з такім разлікам, каб заставаўся дзень на паўтарэнне. Адказваць заўсёды іду ў першай пяцёрцы: тады менш хвалюешся ля дзвярэй.

**Аляксей ЛЮБІМАЎ, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце:**

— Камітэт камсамола універсітэта ўдзяляе вялікую ўвагу павышэнню якасці ведаў. На працягу года актывізавалі сваю работу вучэбна-выхаваўчыя камісіі, камітэты камсамола факультэтаў павысілі патрабавальнасць да тых студэнтаў, якія маюць акадэмічныя запазычанасці. Але наша галоўная задача не караць такіх студэнтаў, а дапамагаць ім у вучобе. І ў гэтым напрамку вялікую работу праводзіць савет выдатнікаў. На многіх факультэтах створаны кансультацыйныя пункты, забяспечваецца галоснасць ходу здачы экзаменаў. Напярэдадні сесіі ў групах праведзены сходы, на якіх абмяркоўваўся ход падрыхтоўкі студэнтаў да сесіі.

Запісала
**А. МАТУСЕВІЧ,**
наш кар.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ

Нават не верыцца, што Вользе Васільеўне Казловай, загадчыцы кафедры беларускай літаратуры, на днях спаўняецца 60 гадоў. Няўрымслівасць, маладосць душы, шчырая далучанасць да ўсяго, чым жывуць кафедра, філалагічны факультэт і ўвесь універсітэт, з'яўляюцца характэрнымі рысамі яе шчодрай натуры. Ды, зрэшты, як інакш, без гэтага маладога запалу, можна было б кіраваць такім вялікім, таленавітым, але ў той жа час складаным калектывам, як кафедра беларускай літаратуры! А кіруе кафедрай Вольга Васільеўна з 1973 года, і за гэты час не было ніводнага года, каб па выніках сацыялістычнага спаборніцтва кафедра не заняла першага месца на факультэце.

Кажуць, яблыка ад яблыні недалёка падае. Прымаўка справядлівая і ў гэтым выпадку. В. В. Казлова — родная дачка кафедры. Яе біяграфія — гэта біяграфія адной з вядучых універсітэцкіх кафедраў, якой ад моманту яе заснавання (1943 год, г. Сходня пад Масквой) і да 1971 года кіраваў выдатны вучоны і чалавек, прафесар М. Р. Ларчанка.

М. Р. Ларчанка ў свой час заўважыў студэнтку першых — такіх нялёгкіх! — пасляваенных гадоў, прыняў дзейны ўдзел у яе далейшым лёсе. Вольга Васільеўна пасля заканчэння філфака пастулае ў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры універсітэта, а ў 1953 годзе абараняе кандыдацкую дысертацыю па трылогіі Якуба Коласа «На ростанях». З пачатку 50-х гадоў і да сённяшняга дня яна нязменна працуе на кафедры, узняўшыся па службовай лесвіцы ад выкладчыка, дацэнта кафедры да яе загадчыка, пераняўшы гэтую пасаду яшчэ ад аднаго выхаванца кафедры — І. Я. Навуменкі, цяперашняга акадэміка, віцэ-прэзідэнта АН БССР.

Што ж уяўляе сёння кафедра беларускай літаратуры? На ёй працуе два дзесяткі чалавек, у тым ліку тры прафесары. Восем выкладчыкаў кафедры з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў СССР. Кафедра забяспечвае выкладанне курсаў гісторыі беларускай літаратуры, беларускай вуснай народнай творчасці, тэорыі літаратуры, літаратур народаў СССР і методыкі літаратуры. Праблемы станаўлення сацыялістычнага рэалізму, ідэйна-эстэтычнае багацце і своеасаблівасць беларускага фальклору, сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі народаў СССР і замежных сацыялістычных краін — такія галоўныя кірункі навуковых пошукаў кафедральных літаратуразнаўцаў. Па гэтых праблемах імі апублікавана звыш ста манаграфій, каля дзвюх тысяч артыкулаў і рэцэнзій. На рахунку кафедры добрая сотня арыгінальнай і перакладной паэзіі і прозы. Вучоныя кафедры прымалі ўдзел у міжнародных з'ездах славістаў, навуковых сімпозіумах, чыталі лекцыі ў Сафійскім, Варшаўскім, Кракаўскім, Йенскім універсітэтах, адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі СССР і сацыялістычных краін.

У гэты важкі навуковы і творчы багаж кафедры свой несумненны ўклад уносіць і яе загадчыца. В. В. Казлова з'яўляецца сааўтарам падручніка «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» у 2-х частках, праграмы па гісторыі беларускай савецкай літаратуры для студэнтаў універсітэтаў і педінстытутаў рэспублікі. Ей належаць таксама такія выданні, як «Трылогія Якуба Коласа «На ростанях», «Міхась Лынькоў», «Партызанскі свет у беларускім вершы», звыш 70 артыкулаў і рэцэнзій.

В. В. Казлова вялікую ўвагу ўдзяляе арганізацыі і ўдасканаленню вучэбнага працэсу на факультэце, навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні яна чытае курс гісторыі беларускай савецкай літаратуры, кіруе спецсемінарам, напісаннем курсавых і дыпломных работ.

Вольга Васільеўна з'яўляецца членам вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна і філалагічнага факультэта, каардынацыйнага савета па пытаннях літаратуры пры АН БССР, рэспубліканскага міжвузаўскага аб'яднання выкладчыкаў беларускай літаратуры, навукова-метадычнага савета рэспубліканскага таварыства «Веды», членам рэдкалегіі часопіса «Вестник БГУ». Часта выступае перад працоўнымі рэспублікі, навучэнцамі ПТВ і вучнямі сярэдніх школ. Яна ўзнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», некалькімі Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Пажадаем жа Вользе Васільеўне, заслужанаму работніку вышэйшай школы БССР, у гэтыя юбілейныя дні моцнага здароўя, новых працоўных поспехаў, вясновага настрою, вечнай маладосці душы!

**В. РАГОЙША,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

# «ЧАСАМ ДАРАЖЫЦЬ УМЕЙЦЕ»

**Пройдзе ўсяго некалькі месяцаў, і многія выпускнікі фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна прыйдуць працаваць на ВА «Інтэграл». Цікава, аб чым яны думаюць зараз, у дні здачы дзяржаўных экзаменаў і абароны дыпломных работ? Пра гэта мы папрасілі расказаць студэнтаў V курса.**

**— Скажыце, калі ласка, ці хочацца працаваць самастойна?**

— Так, даўно ахвота заняцца самастойнай справай,— гаворыць Саша Мелех.— Я ўпэўнены, што на прадпрыемстве будзе цікава.

— У цэху працаваць больш складана, а вопыту пакуль што мала. Асабліва не хапае ўмення працаваць з людзьмі,— расказвае Алена Шутава.

**— Усяго некалькі тыдняў — і зусім іншае, самастойнае, дарослае жыццё. Цікава, што больш за ўсё хвалюе на парозе перамен?**

— Як прымуць людзі ў свой калектыў,— лічыць Сяргей Аляксандраў.— Мы, безумоўна, не раз бывалі на «Інтэграле». Пазнаёміліся з арганізацыяй працы, размаўлялі з рабочымі і інжынерна-тэхнічным персаналам. Ставіліся да нас добра. Але адна справа — студэнт, і зусім іншая — работнік, кіраўнік. Галоўнае — знайсці кантакт з людзьмі.

**— А ці не клапоціць тое, што набытых ведаў можа аказацца недастаткова?**

— Увогуле, не,— выказвае сваю думку Аляксандр Мелех. — Было б жаданне, а веды можна папоўніць са спецыяльнай літаратуры.

Добра, што пяцікурснікі настроены аптымістычна. Гэта радуе. А зараз размова пойдзе аб тым, як прымаюць на ВА «Інтэграл» выпускнікоў універсітэта. З гэтым пытаннем мы звярнуліся да былых студэнтаў фізфака Дзімы Русецкага і Сашы Балашэнкі, якія ўжо маюць пэўны вопыт работы на прадпрыемстве. Дзіма ведаў, што будзе працаваць на «Інтэграле», і загадзя рыхтаваўся да гэтага.

**Дзмітрый Русецкі:**

— Калі прыйшоў на аб'яднанне, крыху разгубіўся.

Спачатку засумняваўся ў сваіх здольнасцях. А зараз нічога — асвоіўся. Сустрэлі нас, выпускнікоў, добра. Дапамагалі ўсе, хто быў побач, і ў той жа час не скоўвалі ініцыятыву і самастойнасць. А гэта вельмі важна: даць навічку зразумець, што ён нешта можа.

**Аляксандр Балашэнка:**

— Шчыра прызнацца, я чакаў горшага. А зараз падабаецца. Работа сур'ёзная, разам з тым цікавая.

**— З якімі цяжкасцямі сустрэліся вы, маладыя спецыялісты, калі прыйшлі на прадпрыемства?**

— Асноўная цяжкасць — «пераключыцца» са студэнцкага жыцця на працоўнае. Работа патрабуе большай пільнасці і, безумоўна, адказнасці. Пытання з жыллём у нас таксама няма — адразу далі інтэрнат.

На прадпрыемстве працуюць розныя спартыўныя секцыі, можна наведваць калектывы мастацкай самадзейнасці.

— Ёсць, зразумела, і праблемы,— дадае Дзіма.— І не апошняя сярод іх — работа нашай бібліятэкі. На жаль, тут вельмі мала літаратуры па спецыяльнасці.

**— А што б вы хацелі параіць цяперашнім студэнтам фізфака?**

— Жыць змястоўным студэнцкім жыццём. І абавязкова рэгулярна наведваць спецкурсы. Толькі зараз разумееш, наколькі яны неабходныя.

**Н. ПАХОМАВА,**
**Н. СЕМКІНА,**
**студэнткі факультэта журналістыкі.**

ЗАКОН І ТЫ

# ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ

ПАСЛЯДОЎНА праводзячы курс на ўздым дабрабыту народа, Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава лічаць адной з важнейшых задач стварэнне найбольш спрыяльных умоў для росту насельніцтва і выхавання падрастаючага пакалення.

Для вырашэння гэтай сацыяльнай задачы прыняты шэраг нарматыўных актаў і, у прыватнасці, Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 верасня 1974 года «Аб увядзенні дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям». Гэты Указ прадугледжвае назначэнне штомесячнай дапамогі на дзяцей сем'ям, у якіх сярэдні даход на аднаго члена сям'і не перавышае 50 рублёў у месяц. У адпаведнасці з Указам Савет Міністраў СССР зацвердзіў Палажэнне аб парадку назначэння і выплаты дапамогі. Яно вызначае, каму, пры якіх умовах і ў якім парадку назначаецца дапамога.

У адпаведнасці з Палажэннем дапамога назначаецца і выплачваецца сем'ям навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, вучылішчаў, школ і курсаў па падрыхтоўцы кадраў, аспірантаў і клінічных ардынатараў. Прычым толькі тады, калі ў сям'і ёсць дзеці да васьмігадовага ўзросту, а сярэдні сукупны даход на аднаго члена сям'і не перавышае пяцідзесяці рублёў у месяц.

Дапамога назначаецца і выплачваецца маці па месцы яе работы ці вучобы. Калі маці не працуе і не вучыцца, дапамога назначаецца па месцы работы, службы ці вучобы мужа.

Заява падаецца адміністрацыі прадпрыемства ці ўстановы. Да яе павінны быць прыкладзены: даведка аб саставе сям'і, выдадзеная ЖЭС, выканкомам мясцовага Савета — для тых, хто жыве ў дамах на правах асабістай уласнасці, а таксама камендантам інтэрната; копіі пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей, завераныя ў дэканаце факультэта або па месцы прыняцця заявы; даведкі аб даходах кожнага члена сям'і за папярэдні год.

Дапамога назначаецца на дзяцей, якія не дасягнулі васьмі гадоў, і выплачваецца ў размеры дванаццаці рублёў у месяц да канца каляндарнага года або да месяца дасягнення дзіцем васьмігадовага ўзросту ўключна.

У пачатку кожнага каляндарнага года неабходна звяртацца па назначэнне дапамогі на бягучы год. Асобам, якія атрымлівалі дапамогу ў папярэднім годзе, яна назначаецца са студзеня бягучага года незалежна ад месяца паўторнай падачы заявы.

**Т. БЯЛОВА,**
**выкладчыца юрыдычнага факультэта.**

САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!






Нядаўна адбылося ўрачыстае адкрыццё гарадскога фестывальнага клуба, які арганізаваны на базе студэнцкага кафэ «Гаўдэамус» БДУ імя У. І. Леніна. Мітынг адкрыў сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Казулін (на здымку злева). Затым ад імя кубінскіх студэнтаў, што вучацца ў Мінску, выступіў пяцікурснік гістарычнага факультэта Фелікс Вальдэс Гарсія. Ён перадаў сімвалічную эстафету Гаванскага фестывалю Маскоўскаму. Эстафету прыняў першы сакратар Мінскага ГК ЛКСМБ Ю. В. Лавыш.

Фестывальны клуб адкрыты. У ім будуць працаваць чатыры секцыі: дыскусійнага клуба «Палітыка», твой равеснік за мяжой, сустрэчы для вас і секцыя мерапрыемстваў вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска.

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

Прафесар Ізабела Іванаўна Марціновіч закончыла Мінскі юрыдычны інстытут. Яна — першая ў БССР жанчына кандыдат юрыдычных навук, а потым і першая доктар юрыдычных навук. Зараз яна працуе ў БДУ імя У. І. Леніна.

У інстытуце Ізабела Іванаўна была выдатніцай. Сёння мы папрасілі яе адказаць на нашы пытанні.

# ДОБРА ВУЧЫЦЦА — ВЫДАТНА ПРАЦАВАЦЬ

— **Ізабела Іванаўна, як Вы сталі выдатніцай?**

— Не ведаю, я ніколі не ставіла перад сабой такую мэту — стаць выдатніцай. Вучылася, і ўсё атрымлівалася неяк само сабой. А любоў да юрыдычнай дзейнасці ў мяне выхаваў бацька, стары бальшавік, ганаровы грамадзянін г. Оршы.

У час вайны вучылася ў Новасібірскай вобласці, а ў дзесяты клас вярнулася ў Беларусь. Гэта было ў 1944 годзе. Выпускныя экзамены здала на залаты медаль і паступіла ў Мінскі юрыдычны інстытут. Наш выпуск быў другім пасляваенным выпускам. Усе мае аднакурснікі вучыліся ў асноўным добра. Нас радавала тое, што мы маем гэтую магчымасць — вучыцца. Бо ў тыя гады, калі з руін і папялішчаў толькі ўзнімаліся гарады і вёскі, вучыцца было вялікім шчасцем.

— **А ў чым, на Ваш погляд, розніца паміж сённяшнімі студэнтамі і студэнтамі Вашага часу?**

— Усе маладыя людзі аднолькавыя: працалюбівыя, старанныя і дапытлівыя, добрасумленныя. Толькі мне здаецца, што нам была ўласціва большая дысцыплінаванасць, энтузіязм. Я паўтараю, што гэта толькі мая асабістая думка. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што на нашу долю выпала шмат выпрабаванняў. І самае цяжкае — вайна. Мы рана сталі дарослымі. Разам са мною ў інстытуце вучыліся былыя франтавікі, многія працавалі на заводах, фабрыках, у калгасах і адначасова былі студэнтамі. Нялёгкае жыццё навучыла нас з большай сур'ёзнасцю адносіцца да любой справы. Мы перанеслі многае. І ў той жа час разумелі, што цяжкасці гэтыя часовыя, хутка ўсё наладзіцца.

Жылі і вучыліся мы ў корпусе на вуліцы Кірава. Часта пасля заняткаў збіраліся на чай, арганізоўвалі вечары, танцы.

А выдатніца — гэта не самамэта. Няхай не здасца высокімі словамі, але я павінна сказаць, што выдатная вучоба — гэта вынік добрасумленнай працы.

Запісала **А. ЗЯНКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ

*Вось і надышло развітанне. Развітанне з універсітэтам. Ты зараз пяцікурснік, выпускнік. Сёння паявяцца апошнія запісы ў тваёй залікоўцы — ты абараняеш сваю дыпломную работу. Здаецца, усё ўжо пераадолена і можна з палёгкай уздыхнуць. але твар твой заклапочаны. Гэта не клопат чалавека, які не ведае, што рабіць, чым заняцца. Універсітэт даў табе дастаткова ведаў, многаму навучыў. Ты ўсё гэта зможаш выкарыстаць на практыцы. Ты будзеш добрым спецыялістам, будзеш рабіць нашу краіну яшчэ больш прыгожай і магутнай.*

*На здымках: дыпломную работу абараняе выпускніца гістарычнага факультэта Ларыса Касценіч; уважліва слухаюць члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі пад старшынствам члена-карэспандэнта АН БССР, доктара гістарычных навук, дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР П. Ц. Петрыкава выступленні студэнтаў-дыпломнікаў.*





**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

## СТУДЭНТ І НАВУКА

# З ЧАГО пачынаюцца поспехі

У ШКОЛЕ ІГАР быў выдатнікам. Вучоба давалася яму лёгка, і даведаўшыся пра нешта новае, ён адчуваў сябе больш сталым. У старэйшых класах юнак захапіўся радыёфізікай. Дома паявілася спецыяльная літаратура, а ўвесь вольны час без шкадавання быў аддадзены любімаму занятку.

АЛЕ САМАЕ цікавае пачалося тады, калі Ігар Чушанкоў стаў студэнтам факультэта радыёфізікі і электронікі. Паявіліся новыя сябры, зацікаўленыя і дапытлівыя. А кожны дзень быў багаты на адкрыцці. Старонкі сшыткаў хутка запаўняліся радкамі формулаў і лічбаў. І не былі яны для студэнта маўклівымі, а гаварылі, адкрываючы таямніцы навукі. Зразумець строгую мову формулаў дапамагалі настойлівасць і працавітасць. Сур'ёзныя адносіны да вучобы мелі добрыя вынікі: на экзаменах І. Чушанкоў атрымліваў толькі выдатныя адзнакі.

На трэцім курсе Ігар пачаў займацца навуковай работай на кафедры кібернетыкі. Тэма яго даследаванняў — праблемы робататэхнікі. Гадзіны, праведзеныя ў лабараторыі ля складаных прылад, стосы паперы, спісаныя радкамі вылічэнняў,— чалавеку, далёкаму ад навукі, гэта нагадвала б нешта фантастычнае. Ігар на сваю работу глядзеў рэальна, але недзе ў глыбіні душы заставалася адчуванне незвычайнага, такое натуральнае ў яго ўзросце.

З пачуццём адказнасці ставіўся ён і да грамадскай работы: доўгі час узначальваў студэнцкае навуковае таварыства, быў членам камітэта камсамола факультэта.

Першай ацэнкай яго працы была паездка на вучэбна-азнаямленчую практыку ў Балгарыю.

А ў красавіку 1983 года Ігар стаў удзельнікам XXI студэнцкай навуковай канферэнцыі «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», якая праходзіла ў Новасібірску. Яго даклад атрымаў высокую ацэнку.

Хутка пасля гэтага адбылася рэспубліканская студэнцкая навуковая канферэнцыя, на якую І. Чушанкоў падаў дзве работы.

Але найбольш уражанняў пакінуў удзел у рабоце Усесаюзнай школы-семінара маладых вучоных-робататэхнікаў. Ігар быў адзіным студэнтам, але розніцы ва ўзросце і падрыхтаванасці не адчуваў. Мог пасрачаца, выказаць свае думкі і развагі ў размовах і размовах па розных пытаннях.

На семінарах вядучыя вучоныя краіны і іх маладыя калегі абменьваліся вопытам, выказвалі свае меркаванні, што дазволіла, лічыць Ігар, больш глыбока паглядзець на праблемы робататэхнікі. На адным з семінараў выступіў і студэнт з БДУ.

Дадому ён вярнуўся з новымі планамі і задумкамі, а таксама з вялікім жаданнем ажыццявіць іх. Для гэтага патрэбна было працаваць. Бацькі ўжо паспелі прывыкнуць да таго, што сын доўга затрымліваецца на факультэце, а ў нядзелю спяшаецца ў бібліятэку. Тры заявы на вынаходствы з яго удзелам, навуковы артыкул — такім быў апошні год вучобы ленінскага стыпендыята Ігара Чушанкова ва універсітэце.

Зараз І. Чушанкоў — аспірант кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі. Пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры, доктара тэхнічных навук, прафесара А. С. Міхалёва ён працягвае працу над тэмай, якой захапіўся яшчэ ў студэнцкія гады.

**А. ЯКУБЕЦ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ

# ПАВЫШАЕЦЦА АКТЫЎНАСЦЬ

**Яшчэ У. І. Ленін указваў на неабходнасць арганізацыі строгага ўліку і кантролю ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі. Толькі сістэма справаздачнасці здольна пастаянна падтрымліваць належны ўзровень сацыялістычнага спосабу гаспадарання.**

**Прызначэнне народнага кантролю вышэйшай школы вызначаецца задачамі, пастаўленымі перад ёю ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Гэта добра разумеюць члены групы народнага кантролю хімічнага факультэта, што дазваляе лічыць яе адной з лепшых.**

Старшыня групы дацэнт Валерыя Рыгораўна Шлык паказвае акуратна заведзеныя папкі. У іх адлюстравана практычная работа кантралёраў. Перспектыўныя планы работы на пяцігадовы перыяд дапамагаюць улічваць вопыт мінулага, браць з яго ўсё лепшае, неабходнае. Падрабязна складзены пратаколы сходаў па справаздачах і выбарах групы народнага кантролю, спісы членаў за ўсе гады, пратаколы сходаў і пасяджэнняў бюро. У рабоце прымаюцца да ўвагі рэкамендацыі, інструктыўныя пісьмы, пастановы вышэйстаячых арганізацый. А па статыстычных справаздачах можна прасачыць лічбавыя паказчыкі за некалькі гадоў. Акуратна вядзецца журнал уліку заняткаў народных кантралёраў, планаў і матэрыялаў іх вучобы. У асобную папку змешчаны скаргі і заявы работнікаў, копіі дакументаў, накіраваных на разглядданне кіраўнікам падраздзяленняў, вышэйстаячых органаў. Гэта ў асноўным матэрыялы паўторных праверак, акты, суправаджальныя пісьмы.

Заслугоўвае ўвагі работа групы народнага кантролю факультэта па арганізацыі і правядзенню праверак наведвання заняткаў студэнтамі, санітарнага стану вучэбных лабараторый, працоўнай дысцыпліны, работы аддзела забеспячэння, эфектыўнасці выкарыстання абсталявання ў навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем і на факультэце, работы сталовай. Па рэзультатах праверак былі складзены акты, якія абмяркоўваліся на пасяджэннях групы. У мінулым годзе было праведзена 11 рэйдаў па праверцы выкарыстання і ўліку хімрэактываў, працоўнай дысцыпліны, санітарнага стану і ўмоў пражывання студэнтаў у інтэрнаце, выкарыстання ТСН у вучэбным працэсе. Было таксама праверана выкананне вучэбнай работы выкладчыкамі факультэта, а таксама выкананне дэканатам пастаноў партыйнага бюро, сходаў і вучонага савета.

Як бачна, ні адно пытанне, ні адзін бок дзейнасці факультэта не застаўся без увагі, ці то работа са студэнтамі, ці то дзейнасць дэканата, ці то праблемы навукова-даследчай работы студэнтаў. Назіраецца дынаміка росту колькасці праверак, некаторыя з іх паўтараюцца. У большасці выпадкаў рэйды праводзяцца калектыўна, што адбіваецца на якасці і аб'ектыўнасці рэзультатаў. Іх вынікі абмяркоўваюцца на нарадах, агульных сходах калектыву, вывешваюцца на стэндзе народнага кантролю, даводзяцца да ведама супрацоўнікаў усіх кафедраў факультэта. Многія пытанні ўзнімаюцца ў матэрыялах «Камсамольскага пражэктара». Так, старшыня групы В. Р. Шлык неаднаразова выступала ў насценным друку, на партыйных і прафсаюзных сходах факультэта. Група народнага кантролю плануе сваю работу сумесна з партбюро і дэканатам.

Аднак, нягледзячы на станоўчы ход спраў, неабходна яшчэ больш павысіць дзейснасць і рэзультатыўнасць праводзімай работы. Не заўсёды сваімі сіламі група можа вырашыць узнікшыя пытанні. Часта крытычныя заўвагі, выказаныя ў адрас тых ці іншых служб, застаюцца без адказу.

**А. КОНАНАВА,**
член аддзела аргработы і галоснасці камітэта народнага кантролю універсітэта.



*«БЕЛЫЯ ЧАЙКІ...»*

*Фота студэнта V курса біялагічнага факультэта* ***Ігара БЫШНЕВА.***

ЛЯ ПАДНОЖЖА п'едэстала помніка Янку Купалу — людское мора. Гаманкое і вірлівае. Праз год свята паэтычнага слова зноў сабрала разам, у адну сям'ю ўсіх, хто вучыўся ці вучыцца на філфаку. Жаданыя сустрэчы, размовы, роспыты...

Колькі нечаканых сюрпрызаў і прыемных хвілін зведалі ўдзельнікі злёту! Аб гэтым падумалася, гледзячы на нядаўніх выпускнікоў факультэта Алу Канапелька і Уладзіміра Мазго, якія горача віншавалі адзін аднаго. У абодвух адбыліся адметныя падзеі ў творчым жыцці. Ала выдала сваю першую кніжку вершаў, а Уладзіміра прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.





# СВЯТА ПАЭТЫЧНАГА СЛОВА

**Вязынка. Вось ужо восьмую вясну запар у адзін і той жа дзень прыязджаюць на радзіму песняра беларускага народа Янкі Купалы студэнты і выпускнікі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. І не толькі ўшанаваць памяць паэта. Падобныя сустрэчы на купалаўскай зямлі сталі сапраўднай творчай справаздачай.**



Да мікрафона падыходзіць кіраўнік факультэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт», прафесар А. А. Лойка. Ён адкрывае ўрачыстасць.

— Сёння мы ўсе,— гаворыць Алег Антонавіч,— цяперашнія і былыя ўзлётаўцы, студэнты і выпускнікі сабраліся ў госці да вялікага песняра на своеасаблівую справаздачу зробленага за год.

А зроблена, патрэбна сказаць, нямала. Нават звычайны пералік спраў заняў бы нямала газетнай плошчы. Не стаў гэта рабіць і А. А. Лойка, а перадаў мікрафон удзельнікам свята. І над купалаўскай сялібай, над шатамі спрадвечных дрэў, якія некалі пэўна ж чулі, як чытаў свае вершы тут Янка Купала, паплылі меладычныя рытмы ямба і харэя. Аўтары змянялі адзін аднаго, але нязменнай заставалася тэма, якой прысвячалі сваю ліру маладыя паэты. Тэма вайны, тэма гераізму савецкага народа, праяўленага ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Звонкімі ад хвалявання і маладосці галасамі заклікалі ўвесь свет, усё чалавецтва быць пільнымі, не даць разгарэцца пажару новай вайны Галіна Ракоца, Алена Сторажава, Таццяна Марчык, Валянціна Місюк, Міхась Скобла, Леанід Трубач...





Заканчвалі свае выступленні студэнты, члены літаб'яднання «Узлёт». Яго староста пяцікурснік Сяргей Чыгрын апошні падышоў да мікрафона. «Васілю Быкаву» — так называецца верш, што загучаў над квітнеючымі садамі Вязынкі.

Ад імя выпускнікоў філфака, былых членаў «Узлёту» слова мелі Ала Канапелька, Уладзімір Мазго, Леанід Пранчак.

— Тэма вайны, тэма міру, — гаворыць старшыня арганізацыйнага камітэта злёту Б. У. Норман,— не выпадковая на сённяшнім свяце паэзіі, эмблемай якога з'яўляецца белы голуб, голуб міру, які прысеў на рознакаляровую вясёлку. А ў яго дзюбе — рамонак — сімвал XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які неўзабаве пачнецца ў сталіцы нашай Радзімы.

Само свята пачалося задоўга да таго, як пад акампанемент шолаху лістоты стогадовых ліп на сялібе паэта загучалі вершы. А сёмай гадзіне раніцы, пад урачыстыя гукі аркестра, калона будучых філолагаў накіравалася да галоўнага корпуса. Тут усклалі кветкі да мемарыяльнага Знака студэнтам і выкладчыкам універсітэта, якія не вярнуліся з вайны.

...Палатачны лагер, разбіты ля падножжа кургана, на аксамітным фоне маладой травы і лістоты палымнеў рознакаляровымі сцяжкамі і шарамі. Але там не было відаць ніводнага чалавека. Усе сабраліся каля сцэны, дзе выступала харавая капэла АН БССР. З асаблівай цеплынёй віталі гледачы выхад народнай агітбрыгады нашага універсітэта. Завяршыла канцэрт мастацкай самадзейнасці выступленне агітбрыгады будатрада «Мара» філалагічнага факультэта.



А ўвечары, на вяршыні аднаго з маляўнічых вязынскіх курганоў, адкуль відаць усё наваколле, удзельнікі свята запалілі традыцыйнае вогнішча...

**В. ГРАМОВІЧ,**
**наш кар.**



НА ЗДЫМКАХ:

* Выступае агітбрыгада будатрада «Мара».
* Шмат агульных інтарэсаў у студэнта III курса Алега Дышлевіча, які быў вядучым святочнай праграмы, і маладога пісьменніка Уладзіміра Мазго.
* Самы малады паэт — Міхась Скобла.
* Сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта Ірына Крэтовіч хвалюецца: «Ці ўсё добра?».
* Актыў агітбрыгады будатрада «Мара»: апошнія акорды перад выхадам на сцэну (у цэнтры — нязменны кіраўнік агітбрыгады студэнтка IV курса рускага аддзялення Раіса Назаранка).

Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

23 мая 1985 г.
Зак. 2532. АТ 13358.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.